«КАЛІ ЧАС ВЫБРАЎ НАС, МЫ ПАВІННЫ ЗАХАВАЦЬ МІР І СПАКОЙ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ. НАЙВЯЛІКШАЯ ЗАДАЧА»

«Той, хто разрываў повязь пакаленняў, абавязкова спараджаў смуту»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўнутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі складаная таму, што ідзе змена пакаленняў: «Нам вельмі важна не разарваць тыя традыцыі, якія мы стваралі з вамі. Важна, каб нашы дзеці не адкінулі ўсё тое, што мы стварылі. Не таму, што мы ўчапіліся і трымаемся за старое і што гэтае старое абавязкова патрэбна дзецям. Не, не таму. А таму што той, хто рваў повязь пакаленняў, той абавязкова спараджаў смуту як мінімум, як максімум вайну. Нас выратавала тое, што мы заўсёды стаялі на плячах папярэдніх пакаленняў, мы ўвабралі ў сябе ўсё тое, што стварылі нашы бацькі і дзяды. Таму мы выдужалі. Калі гэта ў нейкай дзяржаве разрывалася — абавязкова смута. І гэтым заўсёды ёсць шмат ахвотных скарыстацца. Вельмі хацелася б, каб пры гэтым няпростым працэсе змены пакаленняў мы захавалі ўсё найлепшае, што было створана на нашай зямлі».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэты год асаблівы — гэта год 80-годдзя вызвалення нашай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Для нас ён асаблівы, як ні для якога іншага народа, бо ў гэтыя гады фашысцкай агрэсіі Беларусі не існавала. Яе сцерлі з твару зямлі. Прытым ад заходніх да ўсходніх меж. Усё было знішчана. Людзі захаваліся толькі дзякуючы таму, што іх схавала, атуліла наша прырода, нашы лясы, — сказаў ён. — Няўжо можна забыцца гэтыя намаганні, гэтыя гераічныя подзвігі нашага народа? Мы гэта зрабіць не можам!»

Звяртаючыся да жыхароў Оршы, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што людзі тут жывуць зусім нядрэнна. Рэгіёну пашанцавала на ўрадлівыя землі, якія можна лічыць аднымі з найлепшых у краіне. «Працуй — і атрымлівай ураджай», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт заўважыў, што ў Оршы і побач з горадам пабудавана столькі прадпрыемстваў, што не хапае рабочых рук. Ёсць дзе працаваць і ёсць магчымасць зарабляць для сябе і сваіх дзяцей. «Галоўнае — мір, гэта ўжо мая праблема. Таму давайце, калі час выбраў нас, захаваем мір і спакой», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка перадаў храму ікону «Уваскрэсенне Хрыстова», выкананую майстрамі Свята-Елісавецінскага манастыра. Ікона створана ў традыцыйным для беларускай школы іканапісу стылі, напісана ва ўнікальнай тэхніцы васковай тэмперы. Вобраз цудоўнага Уваскрэсення Хрыста — адзін з найбольш значных для праваслаўных хрысціян. Выява гэтай падзеі сімвалізуе веліч і сілу духу Сына Божага, вызваленне зямнога свету ад граху. У сваю чаргу манахіні падарылі Прэзідэнту ікону святога благавернага князя Аляксандра Неўскага. Ігумення Сусанна расказала, што гэта нябесны заступнік усіх Аляксандраў. Яна пажадала Прэзідэнту здароўя і цярпення.

Сустрэцца з кіраўніком дзяржавы, павіншаваць яго са святам каля храма сабралася нямала людзей. Па прыездзе Аляксандр Лукашэнка пагаварыў з імі на адну з самых важных тэм. Ён расказаў, што на прыкладзе Оршы лічыць неабходным скарэкціраваць падыходы ў жыллёвым будаўніцтве, каб у тым ліку забяспечыць шматлікія прадпрыемствы рабочай сілай. «Я еду і думаю, што нам давядзецца тут будаваць пабольш жылля, каб прыцягнуць людзей. У іх не хапае людзей. Гадоў 20 таму не было куды падзець — беспрацоўе. Цяпер людзі працаўладкаваны. А тут прадпрыемстваў шмат. І ў Барані, і паміж Баранню і Оршай. І ў сельскай гаспадарцы, — сказаў беларускі лідар. — Я думаю, нам трэба пераарыентавацца і будаваць там, дзе патрэбныя рабочыя рукі. Акрамя шматдзетных і ваенных, гэта святое».

Па словах кіраўніка дзяржавы, варта выкарыстоўваць савецкую практыку: ствараць нейкае прадпрыемства, а вакол яго — жыллё. Каб людзей прыцягнуць. «Гэта такія развагі, калі я пад'язджаў да вашага і майго роднага месца», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што з Оршай у яго звязаныя цёплыя ўспаміны. У дзяцінстве ён тут жыў. Маці Прэзідэнта працавала некалькі гадоў на льнокамбінаце, недалёка ад якога быў інтэрнат. «Потым пераехалі ў вёску. Цяжка было тут. Таму пераехалі ў вёску. І ўжо ў Александрыі я ў школу хадзіў», — падзяліўся ўспамінамі Аляксандр Лукашэнка. — Наогул, Орша для мяне такі блізкі, цёплы горад. Вельмі добры горад». Кіраўнік дзяржавы пахваліў мясцовых жыхароў за тое, што ўтрымліваюць у парадку свой горад. «На ўчастках у вас ідэальны парадак. Нават пазайздросціў», — адзначыў Прэзідэнт, гаворачы аб прыватным сектары, міма якога ён праязджаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

г. Орша.

Парламенцкі дзённік

Абарона нацыянальных інтарэсаў і ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва

Адбылося пасяджэнне першай сесіі Савета Рэспублікі восьмага склікання

Парламентарыі адобрылі змяненні ў законапраект па пытаннях Следчага камітэта, ратыфікавалі шэраг міжнародных дакументаў, якія накіраваны на выкананне ўзаемных абавязацельстваў, умацаванне супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі і Экватарыяльнай Гвінеяй. Адобраны законапраект «Аб прыпыненні дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе», які падрыхтаваны з мэтай забеспячэння нацыянальных інтарэсаў нашай краіны і ў якасці меры ў адказ на рашэнне краін — членаў НАТА аб прыпыненні дзеяння дагавора, які быў падпісаны ў Парыжы 19 лістапада 1990 года.

«БЕЛАРУСЬ ПРЫТРЫМЛІВАЕЦЦА РАНЕЙШАЙ АРХІТЭКТУРЫ БЯСПЕКІ Ў ЕЎРОПЕ»

Прадстаўляючы законапраект «Аб прыпыненні дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе», **намеснік міністра замежных спраў Юрый АМБРАЗЕВІЧ** адзначыў, што дагавор прадугледжвае абмежаванне сумарных узроўняў звычайных узбраенняў і тэхнікі па пяці асноўных катэгорыях (танкі, баявыя браняваныя машыны, артылерыя, ударныя верталёты і баявыя самалёты), а таксама механізмы праверкі захавання абавязацельстваў, уключаючы абмен інфармацыяй і інспекцыі.

«Дагавор з'яўляўся адным з ключавых пагадненняў у сферы кантролю над звычайнымі ўзбраеннямі ў Еўропе і краевугольным каменем еўрапейскай бяспекі, ён адыграў знакавую ролю ў зніжэнні ваеннай канфрантацыі і стварэнні новай архітэктуры бяспекі на еўрапейскім кантыненце ў перыяд пасля заканчэння халоднай вайны за кошт беспрэцэдэнтных скарачэнняў узбраенняў, тэхнікі і асабовага складу, — звярнуў увагу намеснік міністра. — Беларусь добрасумленна і ў поўным аб'ёме выконвала абавязацельствы дагавора. Пасля яго ўступлення ў сілу намі было знішчана звыш трох тысяч адзінак звычайных узбраенняў і тэхнікі. Гэта быў наш важкі і ўсвядомлены ўклад ва ўмацаванне агульнаеўрапейскай бяспекі».

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Дзмітрыя ЖУКА**, Дагавор аб звычайных узброеных сілах у Еўропе ў свой час сыграў вельмі важную ролю ў справе разрадкі і зняцця напружанасці ў пачатку 1990-х гадоў. «Але з часам, да цяперашняга моманту, ён па сутнасці страціў сваю сілу, — канстатаваў сенатар. — З 29 краін, якія калісьці яго падпісалі, 25 або выйшлі, або знаходзяцца ў працэсе выхаду з гэтага дагавора. Прычым калі мы кажам аб 22 натаўскіх краінах, то ў Дагаворы засталася толькі адна рэспубліка».

Дзмітрый Жук акцэнтаваў увагу на тым, што Беларусь толькі прыпыняе дзеянне гэтага дагавора. Ён падкрэсліў, што наша краіна заўсёды выконвала свае абавязацельствы, але абстаноўка прымушае нас абараняць свае інтарэсы. Тое, што Беларусь не выходзіць з дагавора, а толькі прыпыняе яго дзейнасць, па словах сенатара, з'яўляецца дэманстрацыяй таго, што Беларусь прытрымліваецца ранейшай архітэктуры бяспекі ў Еўропе і не зачыняе дзверы да канца.

— Па-першае, мы перастанем даваць інфармацыю, якую абавязаны былі даваць іншым дзяржавам аб сваіх узбраеннях, — Дзмітрый Жук канкрэтызаваў, што на практыцы будзе значыць прыпыненне дзеяння дагавора. — Па-другое, мы не станем прымаць інспекцыі і, адпаведна, накіроўваць свае з мэтай кантролю выканання норм гэтага дагавора. І, па-трэцяе, мы не абавязаны будзем прытрымлівацца тых абмежаванняў па колькасці ўзбраенняў, якія былі падпісаны намі ў рамках гэтага дагавора.

НОВЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ СЛЕДЧЫХ І СТАТУС КУРСАНТА

Адобраны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях Следчага камітэта». У прыватнасці, Следчаму камітэту даюцца паўнамоцтвы ў адпаведнасці з ускладзенымі на яго задачамі без згоды фізічных асоб атрымліваць звесткі з інфармацыйных рэсурсаў (сістэм), якія змяшчаюць персанальныя даныя, і мець доступ, у тым ліку аддалены, да гэтых рэсурсаў (сістэм). Павялічваецца гранічны ўзрост прыёму на службу ў Следчы камітэт — з 25 да 28 гадоў. У асоб радавога і малодшага начальніцкага складу Следчага камітэта выключаецца абавязак штогод прадстаўляць дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

Як дадаў **старшыня Следчага камітэта Дзмітрый ГАРА**, з бягучага года, з моманту залічэння на следча-экспертны факультэт Акадэміі МУС, курсанты прымаюцца на службу ў Следчы камітэт і становяцца яго супрацоўнікамі. «Асаблівасцю іх навучання ў ВНУ, якая знаходзіцца ў сістэме органаў унутраных спраў, з'яўляецца іх аператыўнае падпарадкаванне службовым асобам органаў унутраных спраў, — паведаміў ён. — У гэтай сувязі курсанты, па рашэнні міністра ўнутраных спраў і начальніка ўстановы адукацыі, могуць прыцягвацца для выканання асобных задач, ускладзеных заканадаўствам на органы ўнутраных спраў: да аховы грамадскага парадку, забеспячэння грамадскай бяспекі, спынення масавых беспарадкаў. У гэты перыяд на курсантаў распаўсюджваецца статус супрацоўніка органаў унутраных спраў, які прадугледжвае больш шырокі спектр паўнамоцтваў, гарантый прававой і сацыяльнай абароны, чым у супрацоўніка Следчага камітэта».

ААЭ І ЭКВАТАРЫЯЛЬНАЯ ГВІНЕЯ: НОВЫЯ ВЕКТАРЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Членамі Савета Рэспублікі разгледжаны шэраг міжнародных дакументаў. У прыватнасці, ратыфікавана Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне бяспекі і супрацьдзеяння тэрарызму паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Дакумент накіраваны на развіццё двухбаковай дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва ў галіне барацьбы са злачыннасцю, пашырэнне двухбаковага супрацоўніцтва паміж краінамі шляхам абмену інфармацыяй і вопытам па ўсіх пытаннях, якія ўяўляюць пагрозу нацыянальнай бяспецы дзяржаў бакоў у мэтах прадухілення, выяўлення і процідзеяння ўсім узаемна ўзгодненым формам злачыннасці. Пашыраны галіны і кірункі ўзаемнага супрацоўніцтва.

Яшчэ адным крокам па ўмацаванні ўзаемадзеяння з гэтай краінай з'яўляецца ратыфікацыя Меморандума аб узаемаразуменні паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў па пытаннях узаемнага прызнання і абмену вадзіцельскіх пасведчанняў. Такім чынам, прызнаецца сапраўднасць вадзіцельскіх пасведчанняў, выдадзеных грамадзянам, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, знаходзяцца з турыстычнымі мэтамі або ажыццяўляюць працоўную дзейнасць па часовых працоўных дагаворах і кантрактах. Пры гэтым уладальнік вадзіцельскага пасведчання павінен падыходзіць пад патрабаванні мінімальна неабходнага ўзросту, устаноўленага адносна розных катэгорый вадзіцельскіх пасведчанняў.

Беларусь умацоўвае супрацоўніцтва і з Экватарыяльнай Гвінеяй. Аб гэтым сведчаць ратыфікацыя пагадненняў паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Экватарыяльная Гвінея аб заахвочванні і ўзаемнай абароне інвестыцый, аб прадухіленні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў адносна падаткаў на даходы і маёмасць. Першым дакументам ствараюцца спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення інвестыцый, прадугледжваюцца абарона ад прымусовага адабрання маёмасці, раўнасільнай па наступствах экспрапрыяцыі або нацыяналізацыі, а таксама магчымасць звароту ў міжнародны арбітражны суд для абароны сваіх правоў і інтарэсаў, прадугледжаны дзейсныя механізмы для абароны беларускіх інвестараў у Рэспубліцы Экватарыяльная Гвінея. Другім пагадненнем размяркоўваецца права падаткаабкладання паміж дзяржавамі, выключаецца падвойнае падаткаабкладанне, наладжваецца абмен інфармацыяй паміж падатковымі службамі, ажыццяўляецца кантроль над выкананнем плацельшчыкамі падатковага заканадаўства і барацьба з падатковымі парушэннямі.

ПЫТАННІ ЭКСПЛУАТАЦЫІ БЕЛАЭС І СПАГНАННЕ АЛІМЕНТАЎ

Пратаколам аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь атаманай электрастанцыі ад 15 сакавіка 2011 года, за ратыфікацыю якога прагаласавалі сенатары, прадугледжана карэкціроўка (перанос) тэрміну ўводу ў эксплуатацыю другога энергаблока Беларускай АЭС з 2022 на 2023 год. Замацавана палажэнне аб тым, што бакі ў перыяд эксплуатацыі Беларускай АЭС забяспечваюць фарміраванне і сумеснае выкарыстанне абсталявання, вузлоў і запасных частак з вытворчых запасаў, якія выкарыстоўваюцца на АЭС у Рэспубліцы Беларусь і аналагічных АЭС у Расійскай Федэрацыі, у парадку, які вызначаецца ў пагадненні і дагаворах (кантрактах) паміж беларускімі і расійскімі арганізацыямі, упаўнаважанымі кампетэнтнымі органамі бакоў.

Пратаколам вызначаецца, што парадак фарміравання цаны на ядзернае паліва і ўмовы яго пастаўкі ўзгадняюцца кампетэнтнымі органамі бакоў і замацоўваюцца ў дагаворах (кантрактах) паміж беларускімі і расійскімі арганізацыямі, упаўнаважанымі кампетэнтнымі органамі бакоў. Прадугледжваецца магчымасць устанаўлення гарантыйнага тэрміну на асобнае абсталяванне Беларускай АЭС на перыяд больш як два гады з замацаваннем канкрэтных тэрмінаў у кантрактах, заключаных паміж заказчыкам і генеральным падрадчыкам, тады як дзеючай рэдакцыяй пагадненне гарантыйны тэрмін абмежаваны двума гадамі.

Ратыфікаваны Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб парадку ўзаемнага выканання судовых пастаноў па справах аб спагнанні аліментаў ад 3 сакавіка 2015 года. Прызнана мэтазгоднасць замацавання ў дакуменце магчымасці накіравання спагнальнікамі і органамі прымусовага выканання дакументаў кампетэнтных судоў бакоў Пагаднення для ўзбуджэння выканаўчага вядзення ў выпадку наяўнасці звестак аб працаўладкаванні даўжніка і адсутнасці звестак аб яго рэгістрацыі па месцы жыхарства. Уносяцца дапаўненні, якія прадугледжваюць, што ў выпадку змены арганізацыі або іншай асобы, якая выплачвае даўжніку даход, выканаўчы дакумент, які паступіў ва ўпаўнаважаны орган для выканання па месцы атрымання даўжніком даходу, падлягае далейшаму выкананню на тэрыторыі таго ж боку ў адпаведнасці з яе нацыянальным заканадаўствам. Ратыфікацыя пратакола будзе садзейнічаць прадастаўленню грамадзянам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі дадатковых гарантый па бесперашкодным спагнанні аліментаў з даўжнікоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі другога боку.

Сенатары ратыфікавалі Пагадненне аб правілах выпуску (выдачы), абарачэння і пагашэння ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза складскіх пасведчанняў на сельскагаспадарчую прадукцыю, падпісанае ў Маскве 31 ліпеня 2023 года. Устанаўліваюцца адзіныя падыходы да абарачэння і пагашэння складскіх пасведчанняў, патрабавання да тыпавога публічнага дагавора захоўвання, прадастаўлення складу права выпуску (выдачы) складскіх пасведчанняў. Вызначаюцца кірункі забеспячэння дзяржаўнага кантролю ў гэтай сферы, абавязковыя звесткі, якія змяшчаюцца ў складскім пасведчанні, і пералік звестак, што размяшчаюцца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, што датычацца функцыянавання нацыянальнай сістэмы абарачэння складскіх пасведчанняў.

У размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей СІВЕЦ** рэзюмаваў, што праекты законаў, звязаныя з ратыфікацыяй пратаколаў, мемарандумаў, пагадненняў з замежнымі краінамі, адобраныя сенатарамі, уключаюць шырокі спектр пытанняў. «Пачынаючы ад забеспячэння бяспекі і барацьбы з тэрарызмам да прызнання ўзаемных абавязацельстваў па абмене і прызнанні вадзіцельскіх правоў з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, прызнанні ўзаемнага парадку выканання судовых пастаноў па справах спагнання аліментаў, абароне інвестыцый і іншае, — канкрэтызаваў ён. — Гэтыя пытанні так ці інакш накіраваны на ўмацаванне міжнароднай дагаворнай базы нашай краіны з замежнымі дзяржавамі, забеспячэнне і рэалізацыю гарантый, правоў і свабод нашых грамадзян. У далейшым дзейнасць і ўрада Рэспублікі Беларусь, і парламентарыяў будзе накіравана на тое, каб пашыраць рамкі супрацоўніцтва з дзяржавамі, якія на канструктыўнай, узаемавыгаднай і раўнапраўнай аснове гатовы супрацоўнічаць з нашай краінай, у тым ліку па сродках нармалізацыі ўзаемных правоў і абавязкаў у рамках міжнародных дагавораў, пагадненняў».

Напрыканцы пасяджэння першай сесіі Савета Рэспублікі восьмага склікання **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** ўручыла членам верхняй палаты парламента службовыя пасведчанні, павіншавала іх з Вялікаднем і надыходзячым Днём Перамогі. «Вы ведаеце, які для нас гэта святы дзень, гэты год для нас асаблівы: мы адзначаем 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — падкрэсліла спікер. — Мы цяпер шмат гаворым аб той трагедыі, якая адбылася ў нашай краіне. Па гістарычных мерках, напэўна, не так даўно, па мерках жыцця чалавека — ужо адчувальна. Але памяць ніколі не патухне ні ў нашых сэрцах, ні ў нашых душах, бо гэта кожны трэці загінулы — гэта гора і пакуты маці, жонак, сем'яў, якія страцілі сваіх родных і блізкіх. А колькі пакалечаных лёсаў. Гэта рана, якая не зажывае. Хачу пажадаць толькі мірнага неба ў нашай суверэннай, незалежнай роднай Беларусі. Для гэтага ў нас усё ёсць. Для гэтага мы павінны разумець тыя задачы, якія агучыў перад намі Прэзідэнт на VII Усебеларускім народным сходзе. Мы з вамі з'яўляемся не толькі членамі Савета Рэспублікі, мы з вамі яшчэ і дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, таму адказнасць на нас асаблівая. Я ўпэўнена, што мы зробім усё, што ад нас залежыць, для таго, каб мір і спакой былі на нашай зямлі».

Вераніка КАНЮТА.

Блізкая ўлада

Ігар СЕРГЕЕНКА:

«Павінен быць адзіны падыход на ўсіх узроўнях»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу правёў асабісты прыём грамадзян

Фота БелТА.

Такая форма работы, як асабістыя прыёмы грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, ужо даўно стала візіткай дзейнасці органаў улады ўсіх узроўняў. Да яе далучаны практычна ўсе дзяржаўныя органы: і мясцовыя, і рэспубліканскія, міністэрствы, дэпутацкі корпус краіны. Гэта не толькі дзейсны механізм вырашэння праблем насельніцтва, але і найбольш поўная зваротная сувязь, магчымасць трымаць руку на пульсе жыцця краіны і літаральна з першых вуснаў пачуць, што турбуе людзей.

Ігар Сергеенка адзначыў, што і кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання, і кіраўніцтва Пастаянных камісій працягваюць работу па прыёме грамадзян як у рэгіёнах, так і непасрэдна ў Мінску. Інфармацыя аб тэрмінах і месцах сустрэч размешчана на сайце парламента, публікуецца ў друкаваных СМІ. Такім чынам, з тым, каб звярнуцца па дапамогу да дэпутатаў складанасцяў не ўзнікае.

Іншая справа, што шэраг пытанняў можа і павінен вырашацца намнога раней, без зваротаў у вышэйшыя інстанцыі. «Трэба адзначыць, што гэта дрэнна, калі чалавек не атрымлівае адказ на месцах і ідзе далей і далей. А толькі потым, праз неймаверныя намаганні, пытанне вырашаецца. Павінен быць адзіны падыход усюды, на ўсіх узроўнях. Трэба дзейнічаць супольна, — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Не можа быць розначытанняў: недзе там не вырашылі, чалавек звяртаецца «наверх» і спадзяецца на нейкага добрага, суперуважлівага кіраўніка, які ўсё зробіць, дарогу, напрыклад, заасфальтуе... Такога быць не павінна».

Спыніўся ён і на змесце зваротаў, умоўна падзяліўшы іх на некалькі тэм. Так, першая частка звязана з вырашэннем пытанняў, якія датычацца непасрэдна дзейнасці мясцовых органаў улады. Гэта ўладкаванне дарог, пытанні дачных таварыстваў, а таксама яшчэ шмат іншых тэм, якія з-за тых ці іншых абставін не вырашаюцца своечасова. З аднаго боку, не хапае фінансавых сродкаў для таго, каб, напрыклад, заасфальтаваць усе дарогі ў раёне. Зразумела, што выбіраюцца тыя, дзе гэта сапраўды неабходна ў першую чаргу. Але, як заўважыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, ёсць і такія пытанні, што, на жаль, замаруджваюцца па віне тых жа кіраўнікоў на месцах, якія не могуць патлумачыць людзям, што існуе чарговасць у выкананні тых ці іншых работ, пэўныя тэрміны і планы.

Яшчэ адна частая тэма зваротаў — вырашэнне ўсялякага роду жыллёвых і зямельных пытанняў, якія часцяком пераходзяць у рэчышча міжасабовых канфліктаў. Такія выпадкі найбольш частыя ў дачных кааператывах, жылых масівах. І зноў жа, па сутнасці, гэтыя пытанні могуць вырашацца на месцах, без прыцягнення вышэйшых органаў улады.

Асобна Ігар Сергеенка згадаў заяўнікаў, якія не згодны з судовымі рашэннямі. У гэтым выпадку, па яго словах, адказ толькі адзін: судовая ўлада ў нашай краіне — гэта асобная галіна ўлады, і ў адпаведнасці з заканадаўствам умяшанне ў яе дзейнасць не дапушчальна.

Пры гэтым ён адзначыў, што рэагаваць неабходна на ўсе звароты, шукаць магчымыя шляхі вырашэння праблем, а калі гэта немагчыма па тых ці іншых прычынах, то трэба людзям так і казаць. Тлумачыць, што пэўнае пытанне не можа быць вырашана так, як яны хочуць, бо гэта не адпавядае заканадаўству.

«Усю інфармацыю, што да нас прыходзіць, трэба ацэньваць, разумна з ёю абыходзіцца, вылучаць рацыянальнае і па магчымасці дапамагаць людзям», — рэзюмаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

Польскі суддзя папрасіў палітычнага прытулку ў Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Томаш Шміт зачытаў беларускім журналістам сваю заяву да кіраўніцтва польскай судовай сістэмы і прэзідэнта краіны Анджэя Дуды: «Я падаю ў адстаўку з пасады суддзі ваяводскага адміністрацыйнага суда горада Варшавы. Адстаўка з пасады суддзі — гэта выказванне пратэсту супраць неспраўядлівай і несумленнай палітыкі, якую праводзяць улады Польшчы ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Гэты ўчынак таксама з'яўляецца выказваннем пратэсту супраць дзеянняў, накіраваных на ўцягванне маёй краіны ў непасрэдны ўзброены канфлікт з Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Гэта таксама заклік да польскіх улад нармалізаваць і ўрэгуляваць добрасуседскія адносіны паміж Рэспублікай Польшча, Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй». Заяву аб адстаўцы ён падпісаў непасрэдна ў прэс-цэнтры.

Журналісты пацікавіліся, ці не баіцца Томаш Шміт рэакцыі польскіх улад. Ён адзначыў, што разумее: вяртанне ў Польшчу пагражае яму турмой. Па яго словах, ён разумее, што польскія ўлады змогуць абвінаваціць яго ў шпіянажы, спецслужбы могуць выкарыстаць іншыя спосабы. «Калі я хачу жыць, вяртанне ў Польшчу для мяне немагчыма», — заявіў Томаш Шміт. Польскі суддзя папрасіў абароны ў беларускіх улад. Пры гэтым ён падкрэсліў, што гатовы да прэсінгу з боку польскіх улад ці спецслужбаў, у тым ліку і інфармацыйнага. «Я ведаю, як працуюць медыя на Захадзе, ведаю, як яны працуюць у Польшчы. Напэўна, з мяне зробяць альбо шпіёна, альбо наркамана. Выставяць мяне чалавекам, у якога ёсць даўгі, які кінуў жонку. Няхай паспрабуюць. Я гатовы да гэтага. Спадзяюся, тут вы даведаецеся, які я на самай справе», — сказаў Томаш Шміт.

Польскі суддзя расказаў, што за тыдзень знаходжання ў Мінску паспеў крыху пазнаёміцца з Беларуссю і яе сталіцай. «Тут краіна, у якой можна спакойна жыць, у якой вялікі патэнцыял. І тут вельмі мудры кіраўнік. Я думаю, што беларусы часам самі не ўсведамляюць, якія ў іх вялікія магчымасці для развіцця. Тут спрабавалі зрабіць майдан — не атрымалася. Паспрабавалі знішчыць Беларусь эканамічна праз увядзенне розных санкцый — таксама не атрымалася», — сказаў ён. Томаш Шміт падкрэсліў, што яго ўразіла, як у Беларусі спалучаюцца традыцыі і сучаснасць, таксама ён адзначыў гасціннасць беларускіх людзей. «Я крыху прыглядаўся да вас, беларусаў. Я кажу вам гэта не для таго, каб вам было прыемна, а толькі для таго, каб вы ведалі, як насамрэч. Вы вельмі працавіты народ. Вы вельмі добра арганізаваныя. У вас вельмі вялікі патэнцыял. І найперш у вас вельмі добры Прэзідэнт», — сказаў ён. Па словах былога польскага суддзі, у Беларусі ён плануе накіраваць свае намаганні на тое, каб расказаць суайчыннікам, якая на самай справе Беларусь. «У нас устаноўлена інфармацыйная блакада, таму цяжка даведацца, што сапраўды адбываецца ў Беларусі і Расіі. Адзіны спосаб атрымаць інфармацыю — карыстацца Telegram, які пакуль не заблакіраваны, — сказаў Томаш Шміт. — У вас людзі вельмі прыязна ставяцца да іншаземцаў. Калі людзі даведваюцца, што я з Польшчы, то з гэтым няма ніякіх праблем, да гэтага ставяцца нармальна. Я хацеў бы запрасіць сваіх землякоў, жыхароў прыбалтыйскіх краін сюды. Прыязджайце ў Беларусь, параўнайце тое, што піша ваша прэса, з тым, як тут насамрэч ідуць справы».

У цэлым, па словах Томаша Шміта, простыя палякі абсалютна прыязна ставяцца да беларусаў. «Акрамя негатыўных дзеянняў медыя, я ніколі не адчуваў, што палякі неяк негатыўна ставяцца да Беларусі. Таксама як і да расіян. Насамрэч, няма ніякіх праблем: мы разам супрацоўнічалі, наведвалі адзін аднаго. Каб зразумець тое, што адбываецца, трэба разумець, што польская палітыка да канца не незалежная. Вельмі вялікі ўплыў з боку ЗША і Вялікабрытаніі. Большасць польскіх палітыкаў рэалізоўваюць амерыканскія і брытанскія інтарэсы, што не адпавядае польскаму праву», — заявіў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.